УДК 821.161.3-312.9*Я. Баршчэўскі

М. А. Прахарэнка

Навук. кір. – І. Ф. Штэйнер, д-р філал. навук, прафесар

# МАГІЧНЫЯ МЕТАМАРФОЗЫ Ў ТВОРАХ Я. БАРШЧЭЎСКАГА

У артыкуле разглядаецца прыём магічнай метамарфозы і спецыфіка яго выражэння ў творчасці Я. Баршчэўскага. Матыў магічнай метамарфозы, распаўсюджаны ў фальклоры, міфалогіі і літаратуры, з�much"яўляецца характэрнай рысай творчасці Я. Баршчэўскага. Валодаючы сюжэтастваральнай функцыяй, метамарфоза надае тэксту твора дадатковы каларыт, спрыяе ўцягненню чытача ў апавяданне. У ходзе аналізу міфалагічных сюжэтаў у тэкстах вызначаюцца віды і спосабы трансфармацый, што адбываюцца з галоўнымі героямі. Разглядаюцца метамарфозы, у выніку якіх утвараюцца як адушаўлѐныя, так і неадушаўлѐныя прадметы.

Чароўныя гісторыі, легенды і паданні існуюць у кожным куточку нашае зямлі. Іх распавядаюць бабулі сваім унукам, яны гучаць з вуснаў падарожных, перадаюцца з пакалення ў пакаленне, змяняюцца, але ўсѐ роўна захоўваюць нацыянальны каларыт. Знаходзяцца людзі, якія пачынаюць запісваць легенды, перапрацоўваць, а часам складаць новыя. Гэтак з‘явіліся творы М. В. Гогаля, П. П. Бажова, братоў Грым і інш. Для Беларусі такім збіральнікам легендаў і паданняў стаў Я. Баршчэўскі. Пісьменнік свабодна змешваў розныя міфалагічныя вобразы, звяртаўся да дэманалогіі, чаго раней не рабілі ў літаратуры. Гэтак былі напісаны балады «Русалка-спакусніца», «Дзве бярозы», «Зарослае возера», аповесць «Душа не ў сваім целе», кніга «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» і інш. У творах Я. Баршчэўскага шырока распаўсюджаны сюжэты, заснаваныя на матыве метамарфозы. На думку А. Ф. Лосева, кожная рэч у міфалагічнай свядомасці «пераўтвараецца ў іншую і кожная рэч мела свае ўласцівасці і асаблівасці іншай рэчы» [1, с. 79]. Метамарфоза – адзін з самых даўніх і эфектыўных стылістычных прыѐмаў, які шырока адлюстраваны ў міфалогіі, фальклоры і разнастайных жанрах мастацкай літаратуры. Литературоведение 88 У энцыклапедычным слоўніку «Беларуская міфалогія» падаецца наступнае азначэнне метамарфозы: «Метамарфозы - у міфалогіі ператварэнне адных існасцяў у другія. Метамарфозы ў міфах адлюстроўваюць назіранні над рэальнай усеагульнай узаемасувяззю і ўзаемазалежнасцю ў прыродзе, захаванню ў ѐй рэчыва і энергіі, што пераходзіць з адной формы ў другую» [2, с. 321]. Метамарфозы могуць быць пастаянныя: персанаж, ператварыўшыся, застаецца ў новым стане назаўсѐды, і часовыя: зачараваны персанаж пасля пэўнага прамежку часу або выканання некаторых магічных дзеянняў вяртае сваѐ ранейшае аблічча. Метамарфозы нярэдка становяцца рухаючай сілай сюжэта. Гэтак у баладзе «Русалка-спакусніца» з дзяўчынай, што ўжо стала русалкай, тройчы адбываюцца метамарфозы. Галоўная гераіня балады, пакутуючы ад нявернасці каханага, ператваралася спачатку ў гуску, затым у ластаўку, а потым у муху дзеля таго, каб сваімі вачыма пабачыць здраду паніча. У прыведзеным вышэй прыкладзе мы назіраем так званую часовую метамарфозу з наступным вяртаннем у першапачатковае аблічча. Такі від метамарфозы мае прамую адсылку да пярэваратніцтва. У беларусаў з‘ява пярэваратніцтва называецца ваўкалацтвам, таму што звязана з ператварэннем зачараванага чалавека ў ваўка. Беларускі даследчык А. Ненадавец схільны разглядаць ваўкалацтва як спецыфічна беларускую з‘яву [3]. Але воўк як татэмная жывѐла сустракаецца ў народаў Еўразіі і індзейцаў Амерыкі, пра што пісаў яшчэ Герадот. Міфы і казкі розных народаў дэманструюць шырокі спектр ператварэнняў не толькі ў жывѐл, але і ў птушак, расліны. З‘ява пярэваратніцва апісана Я. Баршчэўскім у апавяданні «Ваўкалак» з кнігі «Шляхціц Завальня». На думку М. Хаўстовіча, «Я. Баршчэўскі праз трансфармацыю прымхаў пра ваўкалакаў імкнуўся расказаць пра такую страшную для тагачаснага сялянства з‘яву, як рэкруцтва. Пісьменнік падаў рэкрутаванне селяніна як перамяненне чалавека ў ваўкалака» [4, с. 119]. Апавяданне пачынаецца прыездам да Завальні пана Марагоўскага, які распавядае пра сустрэчу з ваўкамі па дарозе да маѐнтка. Жаданне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пана стрэліць у драпежнікаў перапыніў фурман Якуш словамі: «Не страляй, пане, бо ў іх душы чалавечыя. Калі заб'еш якога, дык душа ягоная пойдзе ў пекла, не адпакутваўшы за грахі» [5, с. 126]. Са слоў фурмана можна здагадацца, што ваўкалакамі становяцца тыя, хто саграшыў: звярнуўся да нячыстае сілы. 89 Ваўкалак – гэта чалавек, які па сваёй волі або міжволі быў трансфармаваны ў ваўка. Вобраз ваўкалака сустракаецца ў многіх славянскіх народаў. П. Шпілеўскі адзначае: «Больш за ўсіх славянарускіх і нават, наогул, славянскіх плямёнаў можа пахваліцца шматлікімі павер'ямі і апавяданнямі пра ваўкалакаў Беларусь» [6, с. 12]. Уяўленні пра ваўкалацтва склаліся ў далёкай старажытнасці падчас паляўнічых заняткаў. Кожнае племя мела сваю татэмную жывёлу, якую ўшаноўвала. Дзеля сувязі з продкамі, у дзень зімовага сонцастаяння, мужчыны апраналі скуру ваўка, што сімвалізавала іх ператварэнне ў татэмную жывёлу. Дадзенае пераапрананне давала магчымасць прасіць у продкаў дапамогі і абароны. Від жывёлы, у якую ператвараўся чалавек, залежыць ад рэгіёна: калі ў Беларусі часцей за ўсё адбывалася трансфармацыя ў ваўка, то ў краінах Усходу такой жывёлай была ліса. Варта адзначыць, што метамарфозы могуць адбывацца па волі персанажа або супраць яго волі пад уздзеяннем іншай асобы. У працэсе развіцця грамадства абрад пераапранання ў скуру татэмнай жывёлы страціў сваё значэнне і быў пераасэнсаваны як магічныя дзеянні чараўніка ў дачыненні да аднаго чалавека або групы людзей. Чараўнік ператвараў чалавека ў ваўкалака па сродках магічнай замовы. Такія людзі былі ахвярамі чараўніка, яны не шкодзілі людзям і часцей за ўсё хаваліся ў лесе. Таксама ў народных уяўленнях адзначалася існаванне чараўніка-ваўкалака, які ператвараўся дзеля сваіх карысных мэтаў. Самастойна ператварыцца ў ваўкалака можна было рознымі спосабамі, пачынаючы ад уткнутых у зямлю ножычкаў, колькасць якіх вар'іравалася ад аднаго да дванаццаці, працягваючы асінавым пнём, цераз які патрэбна было перакуліцца, узяўшыся зубамі за адзін яго бок. Колькасць перакульванняў праз пень таксама была розная, з кожным перакульваннем чалавек ўсё больш станавіўся падобным да ваўка. Для абраду пярэваратніцтва была важнай і магічная замова. Лічылася, што калі парушыцца парадак слоў замовы ці нехта забярэ магічныя прадметы, пры дапамозе якіх быў здзейснены абрад, тады ваўкалак ніколі не зможа прыняць чалавечае аблічча. Якуш ў пачатку свайго апавядання адзначае: «Раскажу тое, што пачуў ад свайго суседа: пра гаротніка, якога чараўнік перавярнуў у ваўка і які шмат гадоў пакутаваў, блукаючы па лясах» [5, с. 127]. Зыходзячы з гэтага можна гаварыць аб тым, што метамарфоза адбывалася між волі персанажа. Таксама існуе шэраг твораў Я. Баршчэўскага, дзе адбываецца трансфармацыя персанажа па сваёй волі. Напрыклад, у апавяданні Литературоведение 90 «Зухаватыя ўчынкі» чараўніца Арына мела здольнасць ператварацца ў сароку дзеля таго, каб забіраць малако ў мясцовых кароў. Ведзьма або чараўніца – адзін з галоўных персанажаў беларускай дэманалогіі. Яе адносяць да паўлюдзей-паўдэманаў. У большасці выпадкаў ведзьма паўстае ў антрапаморфным выглядзе, але бывае ў яе і зааморфнае аблічча. Жанчына мае здольнасць ператварацца ў жывёл (ката, свінню, сабаку), птушак (варону, саву, сароку), а таксама ў некаторыя прадметы (кола, клубок нітак, палку). Пастаянная метамарфоза адбываецца з Марыляй і Ясем у баладзе «Дзве бярозы». Мачыха паслала Марылю ў пушчу, а каб дзяўчына не вярнулася, зачаравала дзікі лес. Ясь адправіўся на пошукі каханай, і знайшоў яе ў выглядзе маладой бярозкі. Раніцай пастух убачыў дзве бярозы, якія спляліся галінкамі, нібы ўзяўшыся за рукі. У такім стане каханыя засталіся назаўсёды. Робячы вывад, трэба адзначыць, што матыў магічнай метамарфозы распаўсюджаны ў фальклоры, міфалогіі і літаратуры. Ён з'яўляецца характэрнай рысай творчасці Я. Баршчэўскага. Валодаючы сюжэтастваральнай функцыяй, метамарфоза надае тэксту твора дадатковы каларыт, спрыяе мацнейшаму ўцягненню чытача ў апавяданне. Вылучаюць пастаянныя і часовыя метамарфозы, а таксама метамарфозы, што адбыліся па волі персанажа або супраць яго волі. Спосабы трансфармацыі могуць быць розныя: перакульванне праз пень, пры дапамозе замовы або ўваткнутых у зямлю ножычкаў. Такім чынам, творчасць Я. Баршчэўскага з'яўляецца каштоўным матэрыялам для вывучэння спецыфікі магічных метамарфоз.

Спіс літаратуры 1 Лосев, А. Ф. Філософія. Міфологія. Культура / А. Ф. Лосев. – М.: Политиздат, 1991. – 525 с. 2 Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск: Беларусь, 2004.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– 529 с. 3 Ненадавец, А. М. За смугою міфа / А. М. Ненадавец. – Мінск: Бел. навука, 1999. – 254 с. 4 Хаўстовіч, М. В. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага / М. В. Хаўстовіч. – Мінск: БДУ, 2003. – 204 с. 5 Баршчэўскі, Ян. Выбраныя творы / уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск: «Беларускі кнігазбор», 1998. - 480 с. 6 Шпілеўскі, П. Беларусь у абрадах і казках / П. Шпілеўскі; пер. з руск.; пад рэд. А. Вашчанкі. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2010. – 304 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ